По своей сути, НКВД стало ведомством, которое занималось практически всем в стране [2, с. 15–17.].

С созданием общесоюзного НКВД была сформирована и единая система Главного управления лагерей – ГУЛАГ. Специальные управления ГУЛАГа объединяли многие ИТЛ в разных регионах страны: Соловецкий ИТЛ (СЛОН), Карагандинский ИТЛ (Каргал), Беломорско-Балтийский ИТЛ, Норильский ИТЛ и др. Заключенными ГУЛАГа велось строительство ряда крупных промышленных и транспортных объектов, а за любое нарушение режима применялись суровые наказания.

**Литература**


1 Сборник законодательных и нормативных актов о репрессиях и реабилитации жертв политических репрессий / отв. и сост. Е. А. Зайцев. – Москва : Республика; Верховный Совет Рос. Федерации, 1993. – 224 с.

2 Кудрявцев, В. Н. Политическая юстиция в СССР / В. Н. Кудрявцев, А. И. Трусов. – Москва : Наука, 2000. – 365 с.



***В. С. Войценка***
*Навук. кір.* ***М. І. Чмарава,***
*канд. філал. навук, дацэнт*


## "МАЛАЯ РАДЗІМА" РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ВОБРАЗАХ І СІМВАЛАХ

Адна са скразных тэм Рыгора Барадуліна – тэма Радзімы. Вушача, менавіта так называў свой гарадок Барадулін. Уся яго літаратурная спадчына звязана з родным ушацкім краем. "Я – сын зямлі" – кажа Р. Барадулін у адным са сваіх вершаў. Пачынаючы ўжо з самых першых мастацкіх накідаў да твораў, творчая ўвага пісьменніка канцэнтруецца на вобразе "малой радзімы". Нават самі назвы кніг Р. Барадуліна: "Неруш", "Рум", "Свята пчалы" – падкрэсліваюць сувязь яго паэзіі з фальклорнымі традыцыямі і звычаямі народа. Тэма Беларусі балючая для пісьменніка. Бацькаўшчына – гэта не толькі тое, што мы маем на сённяшні дзень. На старонках яго кніг Беларусь паўстае на розных гістарычных скрыжаваннях. *"Грунвальд – крывіцкай крыві голас, што змогі не мае"* [1, с. 228], *"Васпаватая ад асколкаў і куль, на свет Сафійка глядзіць вачыма цнатлівымі"* [1, с. 84], *"Майданакі, Трасцянцы, Хатыні – Крыжы пакуты Дарог крыжавых"* [1, с. 90]. Зборнік "Вушацкі словазбор" пісьменнік пісаў амаль 60 год. У ёй аўтар сабраў неацэнныя скарбы беларускай мовы: асобныя словы, прымаўкі, пад'ялдычкі, зычэнні, грозьбы і шмат іншага. Шанаванне мовы выявілася ў творах пра малую радзіму, дзе ён выкарыстоўваў адметныя дыялектызмы – родныя для яго словы. Паэт паўстае першаадкрывальнікам шматгалосага характва роднай ушацкай зямлі, звычнага і блізкага яму ўшацкага побыту. Можна меркаваць, што эстэтычнае абуджэнне пісьменніка цалкам звязана з уражаннямі, якія шчодра дарыла яму "малая радзіма".

На працягу многіх дзесяцігодзяў у аўтара не перасыхала творчая крыніца натхнення. Любоў да Радзімы і роднага кутка – стрыжнявы матыў паэзіі Рыгора Барадуліна. Малая радзіма, любая сэрцу Ушаччына, для Р. Барадуліна – духоўна-гістарычная спадчына, вечная і непераходная каштоўнасць быцця. Лірыка народнага паэта светлая, мудрая, глыбока грамадзянская, звязаная нябачнай сілай з трывогамі цэлага свету і з роднай зямлёй.

**Літаратура**


1 Барадулін, Р. Выбраныя творы / Р. Барадулін. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 600 с.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ